# Як атрымаць талон у паліклініцы анлайн?

#яанлайн

**1.** Праверце, ці ўключаны мабільны інтэрнэт: правядзіце пальцам ад верхняй часткі экрана да сярэдзіны і знайдзіце значок з дзвюма стрэлкамі ўверх-уніз.

**2.** Націсніце на іконку браўзера (напрыклад, Google Chrome). У праграме, якая адкрыецца, у радку «Пошук» увядзіце «talon.by».

**3.** Націсніце кнопку «Увайсці», затым «Зарэгістравацца». Увядзіце свой e-mail і прыдумайце пароль.

**4.** Увядзіце свой нумар тэлефона і націсніце «Працягнуць». Устаўце код з атрыманага SMS-паведамлення.

**5.** Націсніце на іконку чалавечка ў верхняй правай частцы экрана, а затым «Дадаць пацыента». Напішыце імя, прозвішча, імя па бацьку, дату нараджэння і іншую неабходную інфармацыю.

**6.** Пасля запаўнення профіля націсніце кнопку «Захаваць».

**7.** Цяпер можна заказаць талон: злева ўверсе націсніце на тры аранжавыя рыскі, а затым на кнопку «Заказаць талон».

**8.** Выберыце паліклініку і доктара, да якога хочаце трапіць (яго спецыяльнасць і самога прафесіянала).

**9.** Вызначце дату і час, якія вам найбольш зручныя, і націсніце на сваю картачку.

**10.** Гатова! Паведамленне пра наведванне доктара прыйдзе вам на пошту. Перад візітам да доктара звярніцеся ў рэгістратуру, каб атрымаць заказаны праз інтэрнэт талон.

**Калі патрэбна дапамога, патэлефануйце:**

________________ (імя)

+375 ________________ (тэл.)

Больш інструкцый на **ionline.A1.by**